**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ЛОЙКА АЛЕГ АНТОНАВІЧ

**ПАЭТ, ПРАЗАІК, ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ**

**1 ТРАЎНЯ 1931 Г. – 19 ЛІСТАПАДА 2008 Г.**

**ФОНД № 240**

**ВОПІС № 1**

**1954 – [да 2008], коп. за 1981–2005 гг.**

**МІНСК 2025**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 240**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.А. ЛОЙКІ | 1-18 | 1-3 |
| 2. | ЗАПРАШАЛЬНЫЯ БІЛЕТЫ НА ВЕЧАРЫ А.А. ЛОЙКІ, ПАШТОЎКА І ПІСЬМО А.А. ЛОЙКІ І ІНШ. | 19-21 | 3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА АБ'ЯДНАННЯ СТУДЭНТАЎ БДУ "УЗЛЁТ" (КІРАЎНІК - А.А. ЛОЙКА) | 22-31 | 3-5 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 32-36 | 5 |

## Прадмова

**Лойка Алег Антонавіч** нарадзіўся 1 траўня 1931 года ў сям'і фельчара ў Слоніме Гродзенскай вобласці. У 1939 годзе скончыў агульнаадукацыйную польскую школу, потым вучыўся ў 2 і 3 класе рускай школы ў Слоніме. У 1953 годзе скончыў філалагічны факультэт БДУ. У 1956 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю ("Адам Міцкевіч і беларуская літаратура"), у 1969 годзе – доктарскую дысертацыю ("Максім Багдановіч і праблемы развіцця беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя"). У 1956 годзе пачаў працаваць на кафедры беларускай літаратуры БДУ (з 1962 года дацэнт, з 1971 года прафесар, з 1985 года загадчык кафедры), у 1991–1996 гадах быў дэканам філалагічнага факультэта. З 1989 года – член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР (цяпер – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі). Апошнія гады жыцця правёў на радзіме, у Слоніме.

З 1960 года член Саюза пісьменнікаў БССР.

Першы верш надрукаваў у "Баранавіцкай газеце" ў 1943 годзе[1]. Выдаў зборнікі вершаў: "На юначым шляху" (1959), "Задуменныя пералескі" (1961), "Дарогі і летуценні" (1963), "Блакітнае азерца" (1965), "Каб не плакалі кані" (1967), "Дзівасіл" (1969), "Калі ў дарозе ты..." (1971), "Шчырасць" (1973), "Пачуцці" (1976), "Лінія жыцця" (1978), "Скрыжалі" (1981), "Няроўныя даты" (1983) і інш. З'яўляўся аўтарам празаічных твораў: аповесцяў "Скарына на Градчанах" (1990), "Кельты не ўміраюць" (1998), раманаў-эсеяў пра Янку Купалу ("Як агонь, як вада...", 1982) і Францыска Скарыну ("Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае", 1990). Напісаў звыш 450 літаратуразнаўчых публікацый, у т.л. 6 манаграфій: "Адам Міцкевіч і беларуская літаратура" (1959), "Новая зямля" Якуба Коласа: Вытокі, веліч, хараство" (1961), "Максім Багдановіч" (1966), "Сустрэчы з днём сённяшнім" (1968), "Беларуская паэзія пачатку ХХ стагоддзя: Некаторыя заканамернасці і асаблівасці" (1972), "Старабеларуская літаратура" (2001). Пераклаў на беларускую мову творы Поля Верлена "У месяцавым ззянні" (1974), І.В. Гётэ "Спатканне і ростань" (1981), вершы польскіх аўтараў для 2х томнай анталогіі польскай паэзіі "Напярэймы: Ад Буга да Віслы" (2003) і інш.

З 1964 да 1989 года кіраваў літаратурным аб'яднаннем студэнтаў-пачаткоўцаў БДУ "Узлёт". З'яўляўся членам рэдкалегій часопісаў "Веснік БДУ" (серыя IV), "Беларусь", "Першацвет" і "Спадчына".

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1976 і 1980), ордэнам Дружбы народаў, медалямі Францыска Скарыны (Беларусь) і за заслугі перад польскай літаратурай (Польшча), Срэбным Ганаровым знакам (Германія); лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа за раман-эсэ "Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае" (1990) і прэміі БДУ імя Уладзіміра Пічэты за падручнік "Старабеларуская літаратура" (2003) і інш. Імем А.А. Лойкі названа адна з вуліц у Слоніме, існуе музейны пакой Алега Лойкі ў Слонімскай раённай бібліятэцы імя Якуба Коласа.

А.А. Лойка памёр 19 лістапада 2008 года, пахаваны ў Слоніме.

[1] https://csl.bas-net.by/personalii/86748/loyko-oleg-antonovich/ (доступ 17.01.2025).

Дакументы А.А. Лойкі паступілі ў БДАМЛМ у два этапы: ад самога фондаўтваральніка ў 1979 годзе і ад У.У. Шалемава (унука) у 2022 годзе. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 36 спраў (868 дак.) за 1954 – [да 2008], коп. за 1981–2005 гг.

Вопіс складаецца з 4 невялікіх раздзелаў.

У першым раздзеле “Творчыя дакументы А.А. Лойкі” прадстаўлены яго вершы, літаратуразнаўчыя працы і інш. Справы сістэматызаваны па жанрах і храналогіі за 1960 – [да 2008] гг.

Другі раздзел “Асабістыя дакументы А.А. Лойкі” сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1977–1981, коп. за 1985–2005 гг.

Трэці раздзел “Дакументы літаратурнага аб’яднання студэнтаў БДУ “Узлёт” (кіраўнік – А.А. Лойка)” сістэматызаваны па відах дакументаў, унутры відаў – па алфавіце аўтараў, унутры твораў аднаго аўтара – па алфавіце твораў за [1960-я – 1970-я гг.].

У чацвёртым раздзеле “Выяўленчыя дакументы” справы складзены па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1956 – [да 2008] гг.

Прадмову склала
заг. аддзела В.Ф. Шаталава
29.01.2025

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 240
ВОПІС № 1
1954 - [да 2008], коп. за 1981-2005

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 19.02.2025
№ 2

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

## 1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.А. ЛОЙКІ

Акраверш, балады, вершы і інш.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | А.А. Лойка "Alesia", "Дзедаў запавет", "Дзень нараджэння", "Культ жанчыны" і інш. Балады і вершы за 1968-2007 гады.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай карэктурай, машынапіс, ксеракопія з газеты, выразка з часопіса | | 118 | 106/136 | |
| 2 | А.А. Лойка. "А свет шырокі і вялікі…", "Любі і помні!", "Прачніся!.." і інш. Акраверш і вершы, прысвечаныя дачцэ Антаніне.<br>Аўтограф | 1973-2004 | 5 | 5 | |
| 3 | А.А. Лойка. "Наш Дзівін (філалагічная паэма)". Няпоўны тэкст.<br>Машынапіс з аўтарскай карэктурай | [да 2008 г.] | 50 | 1 | |

Манаграфіі

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4 | А.А. Лойка. "Новая зямля" Якуба Коласа. Вытокі, веліч, хараство". Манаграфія. Пачатак. Няпоўны тэкст.<br>Чарнавы аўтограф і машынапіс з аўтарскай праўкай, уклейкай і ўстаўкай | 1960-1961 | 127 | 1 | |
| 5 | А.А. Лойка. "Новая зямля" Якуба Коласа. Вытокі, веліч, хараство". Манаграфія. Заканчэнне.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай.<br>На Лл. 145-146 - рабочыя запісы А.А. Лойкі да тэксту (аўтограф) (1960-1961) | 1960-1961 | 146 | - | |

***

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 6 | А.А. Лойка. "Максім Багдановіч". Манаграфія. Пачатак. Без тытульнай старонкі.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1963 | 141 | 1 | |
| 7 | А.А. Лойка. "Максім Багдановіч". Манаграфія. Заканчэнне. Без апошняга раздзела.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1963-1965 | 125 | - | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 8 | А.А. Лойка. "Беларуская літаратура XIX - пачатку XX стагоддзяў". Манаграфія. Пачатак. Чарнавы аўтограф з устаўкай | 1975 | 187 | 1 | |
| 9 | А.А. Лойка. "Беларуская літаратура XIX - пачатку XX стагоддзяў". Манаграфія. Працяг. Чарнавы аўтограф з устаўкай і ўклейкай | 1975 | 153 | - | |
| 10 | А.А. Лойка. "Беларуская літаратура XIX - пачатку XX стагоддзяў". Манаграфія. Працяг. Чарнавы аўтограф з устаўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1975 | 143 | - | |
| 11 | А.А. Лойка. "Беларуская літаратура XIX - пачатку XX стагоддзяў". Манаграфія. Заканчэнне. Чарнавы аўтограф | 1975 | 99 | - | |
| | Лекцыя-агляд, артыкул і інш. | | | | |
| 12 | А.А. Лойка. "Галасы маладых. Лекцыя-агляд творчасці маладых пісьменнікаў і паэтаў Беларусі". Ратапрынт | 1964 | 12 | 1 | |
| 13 | А.А. Лойка. "Новы этап у асэнсаванні літаратурна-мастацкай спадчыны Янкі Купалы і Якуба Коласа". Тэкст даклада. Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай карэктурай | 2002 | 23 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 14 | А.А. Лойка "Зорка Венера". Артыкул. Выразка з часопіса | 1971 | 2 | 1 | |
| 15 | А.А. Лойка "Загадкі і цуды натхнення" (няпоўны тэкст), "У пошуках майстэрства выкладання" і інш. Эсэ. Чарнавы аўтограф, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай, машынапіс | [да 2008 г.] | 37 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 16 | Анатацыя А.А. Лойкі да ўласнай кнігі "Скрыжалі". Рэцэнзія А.А. Лойкі на рукапіс кнігі У. Жылкі "Пожні" (вершы). Прадмова і ўкладанне У.А. Калесніка. Аўтограф | 1978, 1985 | 4 | 2 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 17 | А.А. Лойка "З успамінаў універсітэтчыка", "Успаміны т.зв. грамадскага жыцця" і інш. Успаміны і фрагмент успамінаў.<br>Машынапіс з аўтарскай карэктурай, машынапіс, ксеракопія з друкаванага выдання | 2006 | 28 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 18 | "Стагоддзяў жырандоля". Паэма невядомага аўтара, знойдзеная ў архіве Жыровіцкага манастыра, у перакладзе А.А. Лойкі з рускай мовы на беларускую.<br>Друкаванае выданне | 2006 | 2 | 1 | |
| | **2. ЗАПРАШАЛЬНЫЯ БІЛЕТЫ НА ВЕЧАРЫ А.А. ЛОЙКІ, ПАШТОЎКА І ПІСЬМО А.А. ЛОЙКІ І ІНШ.** | | | | |
| 19 | Запрашальныя білеты на творчыя вечары А.А. Лойкі | 1977, 1981 | 5 | 2 | |
| 20 | Паштоўка А.А. Лойкі да С.П. Шушкевіча.<br>Пісьмо-заяўка А.А. Лойкі дырэктару выдавецтва "Мастацкая літаратура" М.Г. Ткачову на ўключэнне яго зборніка "Скрыжалі" ў выдавецкі план на 1981 год | 1977, 1978 | 3 | 2 | |
| 21 | Дароўныя надпісы А.А. Лойкі П.І. Ткачову (ад 20 красавіка 1981 года), праўнучцы Барбары (ад сакавіка 2005 года), унуку Віталю (ад 1983 года да 2005 года) і інш. на вокладках уласных зборнікаў вершаў ці кніг перакладаў.<br>Ксеракопіі | коп. за 1981-2005 | 9 | 8 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА АБ'ЯДНАННЯ СТУДЭНТАЎ БДУ "УЗЛЁТ" (КІРАЎНІК - А.А. ЛОЙКА)** | | | | |
| 22 | Вершы ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт" Ю. Агараднічэнкі, Л. Анопа, В. Аўчарэнкі, У. Бабраўнічага, Л. Барташа, М. Басака і інш.<br>Аўтограф, сшытак з аўтографам, машынапіс з праўкай, машынапіс.<br>Некаторыя вершы В. Дранчука суправаджаюцца яго замалёўкамі (шарыкавая ручка) (1961 - [1960-я] гады) | [1960-я - 1970-я гг.] | 215 | 92/222 | |
| 23 | Вершы ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт" У. Дубовіка, М. Дуксы, Л. Забалоцкай, С. Законнікава, Э. Зубрыцкага і інш.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з праўкай, машынапіс, ратапрынт.<br>На Л. 3 - суправаджальнае пісьмо У. Дубовіка да вершаў [1965-1967 гады], на Л. 153 - | [1960-я - 1970-я гг.] | 204 | 116/213 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | суправаджальнае пісьмо Л. Кажукоўскай [1960-я гады] і інш. | | | | |
| 24 | Вершы ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт" Г. Каржанеўскай, А. Кірыка, Т. Клімянковай, Л. Колабавай, В. Коўтун і інш.<br>Аўтограф, сшытак з аўтографам, аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з праўкай, машынапіс.<br>На Лл. 7 адв., 26, 28 - суправаджальныя пісьмы Г. Каржанеўскай [1970-я гады], Л. Краўчанкі (1964), К. Кунцэвіч (1971) да вершаў і інш. | [1960-я - 1970-я гг.] | 183 | 114/223 | |
| 25 | Вершы ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт" Г. Пашкова, А. Разанава, І. Рубіна, А. Руцкай, В. Саханкова, Р. Семашкевіча і інш.<br>Аўтограф, сшытак з аўтографам, машынапіс з праўкай, машынапіс, выразка з газеты | [1960-я - 1970-я гг.] | 196 | 143/216 | |
| 26 | Вершы ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт" У. Трусава, А. Трызны, В. Хамчук, Я. Янішчыц, В. Яраца і інш.<br>Аўтограф, машынапіс з праўкай, машынапіс | [1960-я - 1970-я гг.] | 181 | 149/176 | |
| 27 | Вершы неўстаноўленых удзельнікаў літаб'яднання "Узлёт".<br>Аўтограф, машынапіс з праўкай, машынапіс.<br>На Л. 81 - запісы А.А. Лойкі [адносна некаторых вершаў] (аўтограф) | [1960-я - 1970-я гг.] | 81 | 72/91 | |
| 28 | "Прысяга". Зборнік вершаў маладых паэтаў-студэнтаў БДУ. Укладальнік А.А. Лойка. Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф А.А. Лойкі, машынапіс з нязначнай карэктурай укладальніка.<br>На Лл. 95-99 - змест мяркуемага зборніка маладых паэтаў-студэнтаў БДУ (аўтограф А.А. Лойкі) [1960-я - 1970-я гады] | 1969, [1960-я - 1970-я гг.] | 100 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 29 | Вершы Л. Таццянічавай "Зашумяць крутыя вязы" і "Снягі, снягі…" ў перакладзе ўдзельніка літаб'яднання "Узлёт" В. Лапаты з рускай мовы на беларускую.<br>Вершы П. Верлена "Огромный чёрный сон" і А. Рэмбо "Ощущение" ў перакладзе ўдзельніка літаб'яднання "Узлёт" А. Трызны з французскай мовы на рускую.<br>Аўтографы, машынапіс | [1960-я - 1970-я гг.] | 3 | 3/4 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 30 | Апавяданні ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт" В. Амельчыца, М. Аленчыка і У. Самца і інш. Аўтографы, машынапіс | [1960-я -1970-я гг.] | 17 | 4/6 | |
| | *** | | | | |
| 31 | Аўтабіяграфіі і біяграфіі ўдзельнікаў літаб'яднання "Узлёт". Аўтографы А.А. Лойкі і інш. | [1960-я - пач. 1970-х гг.] | 26 | 25/32 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 32 | Балвановіч. Партрэт А.А. Лойкі. Замалёўка з дароўным надпісам Балвановіч А.А. Лойку ад 17 сакавіка 1993 года. Папера, аловак | | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 33 | Фотаздымкі А.А. Лойкі, індывідуальныя. Адзін - з дароўным надпісам А.А. Лойкі "Дачушцы Тонечцы-верабейчыку" (1962) | 1962 - [да 2008 года] | 7 | 7 | |
| 34 | Фотаздымак А.А. Лойкі ў групе з Ю.У. Голубам, Р.М. Семашкевічам і Я.І. Янішчыц | [да 1988 года] | 1 | 1 | |
| 35 | Насценны каляндар "Вядомыя людзі Слонімшчыны" на 2009 год з фотапартрэтам і біяграфічнымі звесткамі пра А.А. Лойку | | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 36 | Фотаздымак бацькоў А.А. Лойкі з дароўным надпісам "Миленькой внучке Тонечке на память" | 1956 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 36 (трыццаць шэсць)

спраў з № 1 па № 36 , 868 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла:
заг. аддзела ______________ В.Ф. Шаталава
22.01.2025

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння ______________ В.І. Бярэйшык
захаванасці дакументаў

"_____"____________20____ г.